Источник: "Веды" - 2013-01-21

**В преддверии Дня белорусской науки творческие работники нашего еженедельника обратились в различные отделения НАН Беларуси с просьбой рассказать читателям о наиболее значимых достижениях минувшего года, обозначить перспективы на будущее. На протяжении нескольких номеров мы попытаемся сложить своеобразную научную мозаику, отражающую отдельные достижения академических ученых.**

# ВАЖНАСЦЬ ПРАЦЫ ГУМАНІТАРЫЯЎ




Вучонымі Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў у 2012 годзе дасягнуты значныя навуковыя вынікі.

Даследчыкі Інстытута сацыялогіі ўпершыню распрацавалі методыку вывучэння асаблівасцей сацыякультурнага развіцця сельскіх рэгіёнаў, прымяненне якой дасць магчымасць фарміраваць больш эфектыўную стратэгію і тактыку кіравання сельскімі рэгіёнамі і павысіць іх інвестыцыйную прывабнасць.

Намаганнямі вучоных Інстытута эканомікі створана методыка ацэнкі эфектаў уступлення Расійскай Федэрацыі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю ва ўмовах Адзінай эканамічнай прасторы для эканомікі нашай краіны.

Шмат увагі Інстытутам гісторыі ўдзяляецца вывучэнню і захаванню гісторыка-культурнай спадчыны. Значны ўклад у захаванне гісторыка-культурнай спадчыны нашай краіны ўносяць выдадзеныя ў 2012 годзе фундаментальныя працы, у ліку якіх: «Полацк», «Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці», 13-ты том «Тэатральнае мастацтва» шматтомнага выдання «Беларусы»; унікальныя калектыўныя манаграфіі: «Хто жыве ў Беларусі» і двухтомная «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.». Падрыхтаваны да друку трэці том «Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока» 6-томнага выдання «Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі». Таксама ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» перавыдадзены ў новай рэдакцыі трохтомны «Беларуска-рускі слоўнік» і трохтомны «Руска-беларускі слоўнік».

Сведчаннем высокай якасці навуковых прац Акадэміі навук з'яўляецца прысуджэнне альбому «Археалагічная спадчына Беларусі» дыплома лаўрэата Міжнароднага конкурсу на лепшы навукова-выдавецкі праект «Навуковая кніга» ў намінацыі «Гран-пры». Дыпломам І ступені Нацыянальнага конкурсу мастацтва кнігі ў намінацыі «Арт-Кніга» ўзнагароджана першая кніга з цыкла «Бібліятэка Радзівілаў Нясвіжскай ардынацыі. Каталог выданняў з фондаў ЦНБ ім. Я. Коласа НАН Беларусі. XV-XVI стст.».

У бягучым годзе намаганні гуманітарыяў будуць накіраваныя на павышэнне эфектыўнасці навуковай дзейнасці, паспяховае выкананне заданняў дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі». Вялікай падзеяй навуковага і культурнага жыцця ў гэтым годзе стане XV Міжнародны з'езд славістаў, які ўпершыню пройдзе ў незалежнай Беларусі. Гэта сведчыць пра рост міжнароднага аўтарытэту і прэстыжу беларускай гуманітарнай навукі і краіны ў цэлым.

У 2013 годзе гуманітарыі парадуюць новымі кнігамі. Так, плануецца выдаць такія фундаментальныя працы, як першы том «Культура сацыяльнай эліты XIV – пачатку XX ст.» трохтомнага выдання «Нарысы гісторыі культуры Беларусі», трэцюю кнігу чацвёртага тома «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя», 14-ты том «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы».

**Падрыхтаваў Сяргей ДУБОВІК, фота аўтара, «Веды»**

Працяг тэмы на стар. 2